**УДК 82-311.9.09** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-78-2-76-79**

# МАСТАЦКАЯ ЎМОЎНАСЦЬ У ТВОРАХ ЛІТАРАТУРНАЙ ФАНТАСТЫКІ ЯК ФОРМА ПАЗНАННЯ СВЕТУ

***канд. філал. навук М.В. ШАМЯКІНА***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0009-0006-9338-362X***

*Артыкул прысвечаны феномену мастацкай умоўнасці навукова-фантастычнага твора. Навуковая фантастыка разглядаецца ў літаратуразнаўчым дыскурсе як разгорнуты разумовы эксперымент, які дазваляе прасачыць развіццё той ці іншай, як правіла, незвычайнай з'явы, убачыць яе ўплыў на асобу і грамадства, асэнсаваць, да якіх змен у блізкай і аддаленай перспектывах яна можа прывесці. У рабоце даводзіцца, што такая асаблівасць фантастычнага твора звязана з магчымасцю мастацкай умоўнасці быць сродкам рацыянальнага пазнання свету, бо базуецца на здольнасці чалавека да абстрактнага мыслення і задзейнічае сродкі, уласцівыя навуковай пазнаваўчай дзейнасці. Пры гэтым паказваюцца адрозненні навуковай і мастацкай мадэлі пазнання.*

***Ключавыя словы**: мастацкая ўмоўнасць, мастацкі свет літаратурнага твора, навуковая фантастыка.*

**Уводзіны**. Мастацкая ўмоўнасць з'яўляецца найбольш прыдатным інструментам для апісання прадметаў і з'яў сродкамі пэўнага віду мастацтва. Мастацкая ўмоўнасць літаратурнага твора прыцягвае пільную ўвагу навукоўцаў яшчэ з 70-х гг. XX ст. (Ю.М. Лотман, Д.С. Ліхачоў, Н.Л. Лейдэрман, В.У. Шапашнікава, і інш.). Вялікі ўклад у вывучэнне мастацкай умоўнасці фантастычнага твора ўнесла расійская даследчыца Алена Коўтун у сваёй працы "Паэтыка незвычайнага: Мастацкія светы фантастыкі, чарадзейнай казкі, утопіі, прытчы і міфа", 1999 г.). Закранаў пытанне мастацкай умоўнасці ў фантастыцы і беларускі навуковец Мікола Хаўстовіч ("Мастацкі метад Яна Баршчэўскага", 2003). Актуальнасць абранай тэмы звязана з тым, што шэраг сучасных філосафаў разглядаюць мастацкую ўмоўнасць у гнасеалагічным ракурсе і бачаць у ёй форму навуковага пазнання свету, уласцівую гуманітарным дысцыплінам. Мэта дадзенага даследавання – даказаць, што падобная роля мастацкай умоўнасці будзе найбольш яскрава выяўляцца ў навукова-фантастычных творах, бо аўтары іх абапіраюцца на рацыянальныя сродкі пазнання рэчаіснасці, у першую чаргу – абстрагаванне, стварэнне мадэляў, аналогію, экстрапаляцыю і інш.

**Асноўная частка.** Расійскія філосафы А.Л. Андрэеў і Т.В. Кузняцова адзначаюць, што "мастацкі аповед (у шырокім сэнсе, уключаючы і літаратурны, і жывапісны, і кінематаграфічны і да т.п. паказ сапраўдных або выдуманых фактаў і падзей), нягледзячы на знешняе падабенства з апісаннем нейкіх рэальных сітуацый, зусім ім не з'яўляецца, а ўяўляе сабой абагульненне рэальнага эмпірычнага матэрыялу" [1, с. 103–104]. У навуковым дыскурсе падобнае абагульненне адбываецца праз пераход ад пачуццёва ўспрымаемых вобразаў да ўзроўню абстракцый. Пры такім падыходзе з бясконцага мноства аб'ектаў і падзей навакольнага свету вылучаюцца тыя, якія непасрэдна звязаны з аб'ектам вывучэння і ўздзейнічаюць на яго. У далейшым даследчык працуе з абстрактнай мадэллю вывучаемага аб'екта, у якой усе сілы і абставіны, што не ўплываюць на яго, ігнаруюцца.

Беларускі навуковец М.В. Хаўстовіч падкрэслівае непарыўную сувязь умоўнасці ў мастацтве з абстрактным мысленнем: "Яна ўзнікае разам з набыццём чалавекам здольнасці абстрактна мысліць. У яе аснове ляжыць прынцып нятоеснасці вобраза і аб'екта, які адлюстроўваецца гэтым вобразам. А таму ўсё мастацтва па сваёй прыродзе ўмоўнае" [2, с. 50]. Такім чынам, мастацкая ўмоўнасць таксама, як і навуковае абстрагаванне, задзейнічае механізмы абстрактнага мыслення. Аднак падыход, які выкарыстоўваецца ў дакладных і прыродазнаўчых навуках, немагчыма прымяніць да працэсу пазнання свету, уласціваму мастацтву, і, у прыватнасці, літаратуры.

На нашу думку, справа, сярод іншага, у тым, што нярэдка адной з вядучых ідэй мастацкага твора з'яўляецца якраз пошук тых самых умоў і абставін, якія ўплываюць на вывучаемы аб'ект – чалавечы характар, соцыўм, гістарычны працэс. Фактычна гуманітарныя навукі, літаратура, мастацтва даследуюць падставы для абстрагавання, акрэсліваюць самую першую прыступку да яго. Як адзначаў Ю. Лотман, "мадэль узнаўляе не ўвесь аб'ект, а пэўныя яго бакі, функцыі і стан, прычым сам факт адбору з'яўляецца істотным звяном пазнання" [3, с. 46]. Мастацкі твор часам дэманструе нам такі адбор. У гэтым выпадку мы адзначаем асаблівы псіхалагізм (калі адбіраюцца факты, што ўплываюць на фарміраванне чалавечай асобы), глыбіню пранікнення ў сацыяльныя працэсы (калі адбіраюцца факты, што дзейнічаюць на эвалюцыю соцыўму), гістарызм і г.д. І не выпадкова, што сучаснаму навуковаму падыходу папярэднічаў сінкрэтычны, у многім мастацкі, падыход. І міфалогія, і магія ў такім ракурсе выглядаюць, як той самы пошук фактараў, якія могуць уплываць на чалавечы лёс ці гісторыю.

Яшчэ адна прычына адрознення навуковай і мастацкай мадэлі пазнання, думаецца, звязана з тым, што многія знешнія з'явы і абставіны рэдуцыруюцца, як і ў выпадку са стварэннем абстрактных мадэляў у дакладных і прыродазнаўчых навуках, але вынікам такога працэсу робіцца не абстрактная схема, а мастацкі вобраз. Праз падобнае абстрагаванне, рэдуцыраванне пэўных працэсаў і з'яў дасягаецца адна з галоўных, на нашу думку, якасцей мастацкага вобраза – здольнасць мінімальнымі сродкамі выявіць як мага большы аб'ём інфармацыі, стварыць аб'ёмную, шматгранную і праўдападобную карціну.

Разважаючы пра ўмоўны характар літаратуры, В.П. Рагойша ўказвае, што дыктуецца яна самой прыродай асноўнага сродку пазнання рэчаіснасці, уласцівага літаратуры, – слова [4, с. 194–195]. З гэтага вынікае і яшчэ

адна асаблівасць літаратурнай умоўнасці і створаных з яе дапамогай мадэляў рэчаіснасці – прынцыповая немагчымасць іх фальсіфікацыі. Цветан Тодараў фармулюе гэта наступным чынам: “Літаратурная мова – мова ўмоўная, і праверка на дакладнасць у ёй немагчымая; дакладнасць ёсць суаднесенасць паміж словамі і рэчамі, што называюцца імі, а ў літаратуры такіх "рэчаў" няма” [5, с. 72]. Але М. Бахцін адзначаў: “Даставернасць, праўда ўласцівыя не самому быццю, а толькі быццю пазнанаму, вымаўленаму” [6, с. 396–397], падкрэсліваючы, што даставернасць – адзнака нашага ўспрыняцця рэчаіснасці, а не рэчаіснасці як такой.

Такім чынам, праўдзівасць, даставернасць выяўленых у літаратуры характараў і сітуацый дасягаюцца не толькі праз змест твора, але і цераз выкарыстанне тых ці іншых фармальных прыёмаў і падыходаў. Таму на працягу XX ст. і па сёння надзвычай актуальнай застаецца стварэнне і ўдасканаленне адпаведнай метадалогіі.

Вынікам мастацкага абстрагавання робіцца мастацкая праўда, аналагічна таму, як навуковы пошук павінен прыводзіць да ісціны, да ўстанаўлення пэўных аб’ектыўных фактаў і заканамернасцей. А. Андрэеў і Т. Кузняцова пішуць: “Жыццёвая праўдзівасць – гэта такая якасць створанага фантазіяй свету, якая прымушае ўспрымаць гэты свет так, нібыта перад намі нешта сапраўды меўшае месца ў жыцці ці, ва ўсялякім разе, магчымае” [1, с. 105]. І адзначаюць далей: “Характэрным выпадкам такога роду з’яўляецца праўда тыповага” [1, с. 105]. Аднак ёсць у літаратуры жанры, дзе менавіта навуковая дакладнасць прыведзеных фактаў з’яўляецца важным складнікам твора. Нярэдка яна выступае не толькі неад’емнай часткай зместу, але нібы падказвае пісьменніку пэўныя прыёмы, вобразнасць, сістэму персанажаў, структуру аповеду. У першую чаргу гэта тычыцца навукова-папулярнай літаратуры і так званай “цвёрдай навуковай фантастыкі” ў літаратуры мастацкай.

Заўважым, што ў навуковай фантастыцы побач з “праўдай тыповага” прысутнічае і “праўда нетыповага”, звязаная з прысутнасцю фантастычнага дапушчэння, якое павінна натуральна ўпісвацца ў сюжэт і ўвесь мастацкі свет твора, быць зразумелым, уяўляючы сабой, аднак, апісанне аб’ектаў і з’яў, не знаёмых чытачу з вопыту паўсядзённага жыцця. Даследчыца фантастыкі А. Фецісава разглядае, як па-асабліваму праяўляецца ў названым жанры гнасеалагічны патэнцыял мастацкай умоўнасці: “Навуковыя веды ўключаюць не толькі аб’ект, але і суб’ект пазнання, што яшчэ больш збліжае навуку з літаратурай, навуковае і мастацкае пазнанне. Навукова-фантастычная літаратура спалучае ў сабе два гэтыя віды духоўных практык, выступаючы своеасаблівым палігонам выяўлення і мастацкага асэнсавання глабальных гіпотэз” [7, с. 13]. Шмат якія пісьменнікі-фантасты, футуролагі і літаратурныя крытыкі разглядаюць навукова-фантастычны твор як свайго роду разгорнуты мысленны эксперымент, які дазваляе не проста прасачыць развіццё і наступствы пэўных з’яў, але ўбачыць іх уплыў на асобу і грамадства, асэнсаваць, да якіх змен у блізкай і аддаленай перспектыве яны могуць прывесці. Е.В. Панохіна піша: “Мастацкі тып мадэлявання дазваляе ў наглядна-вобразнай форме выкласці тыя ці іншыя праекты, гіпотэзы, спрагназаваць іх наступствы, з улікам прыроды і сутнасці чалавека. У філалагічным пазнанні з гэтай мэтай фарміруюцца ўласныя спецыфічныя метадалагічныя сродкі і прыёмы” [8].

З дадзенай уласцівасцю звязаны і вялікі прагнастычны патэнцыял навуковай фантастыкі. Аўтар працы “Рускі савецкі навукова-фантастычны раман” (1970) А.Ф. Брыцікаў разважае: “За сто з лішкам гадоў (лічачы з першых раманаў Жуля Верна) навуковая фантастыка выпрацавала даволі дасканалы інструмент прадбачання. Ён уяўляе цікавасць для мадэлявання ўнутранага свету чалавека і чалавечых адносін, і не толькі ў навуковай фантастыцы, паколькі прагназаванне разам з іншымі элементамі навуковага мыслення пранікае ў метадалогію мастацтва ў цэлым” [9, с. 12]. А.Ф. Брыцікаў паспрабаваў нават вызначыць метады навукова-фантастычнага прагназавання: інтуітыўную здагадку, экстрапаляцыю, аналогію. І ўрэшце канстатуе: “На гэтых "трох кітах" – інтуіцыі, экстрапаляцыі і аналогіі – стаіць і сучасная навуковая прагностыка” [9, с. 12].

Вялікі прагнастычны патэнцыял фантастыкі вывучаюць і сучасныя даследчыкі, звяртаючы ўвагу на здольнасць навуковай фантастыкі прадбачыць пэўныя адкрыцці, культурныя і грамадскія тэндэнцыі. Так, расійскі філосаф Я.В. Цвяткоў у працы “Навуковая фантастыка як спосаб канструявання сацыяльнай рэальнасці” адзначае: “Прагнастычная функцыя сацыяльна-культурнага інстытута навукова-фантастычнай літаратуры зводзіцца не толькі да стварэння новых ідэй, якія вырашаюць існуючыя навукова-тэхнічныя праблемы, але і тых, якія яшчэ не пастаўлены сучаснай навукай і тэхнікай ці не сталі прадметам інтэнсіўных навуковых даследаванняў і тэхнічных распрацовак. Навуковая фантастыка прадчувае навуковыя і інтэлектуальныя дасягненні грамадства, выяўляе тэндэнцыі, якія хаваюцца ў калектыўным несвядомым, але з часам будуць сфармуляваны філосафамі, вучонымі, грамадскімі лідарамі” [10].

Прагнастычная функцыя з’яўляецца далёка не асноўнай у фантастычнай літаратуры, бо яна ў першую чаргу – літаратура, і першасныя яе функцыі – мастацкія. Дарэчы, некаторыя пісьменнікі-фантасты адмаўлялі прагнастычную функцыю літаратуры – яна не толькі не павінна, але і не здольна прадбачыць будучае. Напрыклад, М. Веллер у кнізе “Сябры і зоры” даводзіць, што “браты Стругацкія былі невысокай думкі адносна прагнастычных магчымасцей фантастыкі” і прыводзіць словы Б. Стругацкага: “Я і цяпер лічу, што фантастыка нічога прадказаць фактычна не можа, акрамя банальнасцей ці відавочнасцей, ці выпадковасцей” [11, с. 49]. Аднак адзначае пры гэтым, што “Драпежныя рэчы стагоддзя” А. і Б. Стругацкіх (1965) сталі творчай удачай у плане якраз ажыццяўлёных прадказанняў. Сапраўды, гэты твор уражвае іх колькасцю і дакладнасцю. Як бачым, часам практыка літаратурнай творчасці супярэчыць тэарэтычным разважанням аўтараў.

Менавіта дзякуючы мастацкім вартасцям некаторыя фантастычныя творы прыцягваюць увагу чытачоў на працягу многіх дзесяцігоддзяў, нават калі прадказанні, апісаныя ў іх, спраўдзіліся ў рэальнасці ці састарэлі. Такім

чынам, не пацвярджаецца меркаванне А.Н. Стругацкага, які гаварыў: “Калі незвычайнае перастае быць незвычайным, фантастыка перастае быць фантастыкай – мы можам назіраць такі працэс выпарвання фантастычнасці з твораў, прысвечаных навуковым адкрыццям, калі адкрыцці тыя, дзякуючы развіццю навукі і тэхнікі, робяцца элементамі рэальнасці” [12]. На самой справе, мы працягваем успрымаць творы ўсё ж як фантастычныя, нягледзячы на тое, што яны больш не выконваюць прагнастычную функцыю. Скажам, “Гіпербалоід інжынера Гарына” А.М. Талстога і сёння ўспрымаецца як фантастычны твор, хоць мы даўно шырока выкарыстоўваем лазеры. Фантастычнай уяўляецца “Аповесць будучых дзён” Янкі Маўра, пры тым, што многія прадбачанні пісьменніка ў наш час ужо ажыццявіліся. Фантастыкай застаецца і “20 тысяч лье пад вадой” Жуля Верна, хоць тэхнічныя характарыстыкі сучасных падводных лодак далёка пераўзыходзяць вартасці “Наўцілуса”.

**Заключэнне.** Мы мяркуем, што ў жанры навуковай фантастыкі найбольш яўна праяўляецца пазнавальная функцыя літаратурнай творчасці. Гэта звязана з прыродай мастацкай умоўнасці ў цэлым і ў прыватнасці – з наяўнасцю ў разглядаемым жанры фантастычнага дапушчэння. У навуковай фантастыцы фантастычнае дапушчэнне павінна не толькі ўпісвацца ў агульную логіку аповеду, але і адпавядаць пэўным фізічным, біялагічным, грамадскім і іншага роду заканамернасцям аб’ектыўнай рэчаіснасці ці вымышленага пісьменнікам свету.

Адна з мэт навуковага спасціжэння свету – магчымасць прагназаваць далейшае развіццё разглядаемых сістэм і наступствы тых ці іншых умяшанняў у іх. Мастацкая ўмоўнасць, уласцівая літаратуры, дазваляе ствараць мадэлі чалавечых характараў і разнастайных сітуацый, якія сапраўды даюць магчымасць прагназаваць паводзіны людзей і працяканне грамадскіх працэсаў. У выпадку з навуковай фантастыкай яны дазваляюць прадбачыць, а часам і натхняць на стварэнне тэхналагічных навацый і навуковыя вынаходніцтвы. У такім сэнсе мастацкая ўмоўнасць сапраўды выяўляе сябе як спосаб адэкватнага пазнання рэчаіснасці, прычым тых яе бакоў, якія не заўсёды магчыма спасцігнуць праз інструментарый дакладных і прыродазнаўчых навук.

Літаратура, у тым ліку і фантастычная, – гэта нешта большае, чым шлях да спасціжэння свету. Наўрад ці можна вычарпальна апісаць усе яе функцыі, бо таямніца мастацтва ніколі не можа быць разгадана проста таму, што мастацкі вобраз здольны выразіць тыя сэнсы, якія не паддаюцца перадачы ў словах паўсядзённай мовы, у навуковым дыскурсе і любых іншых відах немастацкага выяўлення.

## ЛІТАРАТУРА


1. Андреев А.Л., Кузнецова Т.В. Категория истины и проблема художественной правды // Вестник Московского университета. Серия 7, Философия. – 2015. – № 2. – С. 100–110.
2. Хаўстовіч М.В. Мастацкі метад Яна Баршчэўскага. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2003. – 201 с.
3. Лотман Ю.М. Лекции по структуральной поэтике // Ю.М. Лотман и тартуско-московская семиотическая школа: сб. – М., 1994. – С. 28–245. (Язык. Семиотика. Культура).
4. Рагойша В.П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў. – Мінск : Нар. асвета, 2009. – 303 с.
5. Тодоров Ц. Введение в фантастическую литературу / пер. с фр. Б. Наумова. – М.: Дом интеллектуал. кн., 1999. – 143 с.
6. Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. – М.: Искусство, 1979. – 423 с. (Из истории советской эстетики и теории искусства).
7. Фетисова А.Н. Научная фантастика в условиях модерна и постмодерна: культурно-исторические аспекты : автореф. дис. … канд. филос. наук: 24.00.01 / Юж. федер. ун-т. – Ростов н/Д., 2008. – 21 с.
8. Пахонина Е.В. Истина и правда в филологическом типе научного познания // Актуальные проблемы гуманитарных и естественных наук. – 2013. – № 12-1. – С. 404–407. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/istina-i-pravda-v-filologicheskom-tipe-nauchnogo-poznaniya (дата обращения: 29.11.2024).
9. Бритиков А.П. Русский советский научно-фантастический роман. – Л.: Наука, Ленингр. отд-е, 1970. – 447 с.
10. Цветков Е.В. Научная фантастика как способ конструирования социальной реальности (социально-философские аспекты): автореф. дис. ... канд. филос. наук: 09.00.11 / Помор. гос. ун-т. – Архангельск, 2009. – 24 с. – URL: https://new-disser.ru/_avtoreferats/01004422076.pdf (дата обращения: 21.06.2025).
11. Веллер М. Друзья и звезды: сб. – М.: Астрель, 2012. – 411 с.
12. Стругацкий А.Н., Стругацкий Б.Н. Фантастика – литература (Из материалов дискуссии, состоявшейся в январе 1965 года в ленинградском Доме детской книги) // Публицистика АБС. – URL: http://www.rusf.ru/abs/ludeni/publ-3.htm (дата обращения: 21.06.2025).


*Поступила 04.08.2025*

# ХУДОЖЕСТВЕННАЯ УСЛОВНОСТЬ В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ ЛИТЕРАТУРНОЙ ФАНТАСТИКИ КАК ФОРМА ПОЗНАНИЯ МИРА

***канд. филол. наук М.В. ШАМЯКИНА***
***(Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси)***

*Статья посвящена феномену художественной условности научно-фантастического произведения. Научная фантастика рассматривается в литературоведческом дискурсе как развернутый мыслительный эксперимент, позволяющий проследить развитие того или иного, как правило, необычного явления, увидеть ее влияние на*

*личность и общество, осмыслить, к каким изменениям в ближней и отдаленной перспективе она может привести. В работе приводится, что такая особенность фантастического произведения связана с возможностью художественной условности быть средством рационального познания мира, так как базируется на способности человека к абстрактному мышлению и задействует средства, присущие научной познавательной деятельности. При этом показываются различия научной и художественной моделей познания.*

***Ключевые слова:*** *художественная условность, художественный мир литературного произведения, научная фантастика*

## ARTISTIC CONVENTIONS IN WORKS OF LITERARY FICTION AS A FORM OF COGNITION OF THE WORLD

***M. SHAMIAKINA***
***(Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus)***

*The article examines the phenomenon of artistic conventionality of a science fiction work. Science fiction is considered as a detailed thought experiment that allows us to trace the development of a phenomenon, see their impact on individuals and society, and understand what changes they can lead to in the near and long term. This possibility of a fantastic work is connected with the fact that artistic convention can be a means of rational cognition of the world, since it is based on a person's ability to think abstractly and uses the means inherent in scientific cognitive activity.*

***Keywords:*** *artistic convention, the artistic world of a literary work, science fiction.*